# Бібліяграфічныя дапаможнікі па прыродазнаўчых навуках і тэхніцы

*Р. А. Ровіна, В. А. Касап*

За 2001–2005 гг. бібліяграфічныя рэсурсы навукова-тэхнічнага комплекса, створаныя бібліятэкамі і іншымі ўстановамі рэспублікі, прадстаўлены дапаможнікамі розных відаў. З пункту гледжання колькасных паказчыкаў можна канстатаваць, што іх недапушчальна мала, бо размова ідзе аб такіх галіновых комплексах, як прыродазнаўства і тэхніка. Усе адлюстраваныя ў "Летапісу друку Беларусі" паказальнікі з'яўляюцца навукова-дапаможнымі. Рэкамендацыйных дапаможнікаў у бягучым дзяржаўным выданні не адлюстравана. Але можна дапусціць, што пэўная колькасць іх створана абласнымі бібліятэкамі ці іншымі ўстановамі рэспублікі.

У падрыхтоўцы паказальнікаў прымалі ўдзел Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Цэнтральная навукавая бібліятэка імя Я. Коласа НАН Беларусі, Беларускі інстытут сыстэмнага аналізу, абласныя бібліятэкі і іншыя ўстановы.

Бягучая інфармацыя ажыццяўлялася пераважна аб нарматыўных, патэнтных дакументах, а таксама аб неапублікаваных работах. Так, за аналізуемы перыяд Камітет па навуцы і тэхналогіях пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь і Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці працягвалі публікаваць афіцыйную інфармацыю "Афіцыйны бюлетэнь" аб зарэгістраваных аб'ектах уласнасці ў розных галінах прыродазнаўства і тэхнікі.

Дзяржаўны камітэт па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі Рэспублікі Беларусь 1 раз у два месяцы рыхтаваў інфармацыйны паказальнік "Технические условия" (2668 (2001 г.), 2983 ( 2002 г.), 3302 (2003 г.), (3754 (2004 г.), 138 (2005 г., ч. 1)), а таксама "Каталог" гэтага віду дакументаў па стану на 1 студзеня кожнага года (2984 (2002 г.)).

Таксама выйшлі з друку пад агульнай рэдакцыяй старшыні Дзяржкамітэта па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі Рэспублікі Беларусь В. Карэшкова чарговыя штогадовыя выпускі "Каталога нормативных документов по стандартизации" (32 (2001 г.), 79, 80, 81, 82 (2003 г.)), у якіх адлюстраваны стандарты, кіруючыя дакументы, класіфікатары і іншыя нарматыўныя матэрыялы.

Акрамя таго, падрыхтаваны пералікі нарматыўных дакументаў, якія дзейнічаюць у асобных галінах, напрыклад: "Перечень нормативных правовых актов в строительстве" (3629 (2002 г.), 3639 (2005 г., ч. 1)), "Указатель материалов, опубликованных в Сборниках нормативных документов по вопросам охраны окружающей среды" (2059 (2005 г., ч. 1)) і інш.

Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна працягвала паўгадовыя выпускі паказальніка "Новая производственно-техническая и сельскохозяйственная литература, поступившая в областную библиотеку" (2666 (2001 г.), 2981 (2002 г.), 3300 (2003 г.), 3749, 3750, 3751 (2004 г.)).

Бібліяграфічную і рэфератыўную інфармацыю аб вельмі важных для даследчыкаў і спецыялістаў неапублікаваных крыніцах інфармацыі працягваў рыхтаваць Беларускі інстытут сістэмнага аналізу Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхна-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

логіях – "Бюллетень регистрации НИР, ОКР, ОТР" (2665 (2001 г.), 3299 (2003 г.), 3748( 2004 г.), 2769 (2005 г., ч. 1)) і "Реферативный сборник непубликуемых работ: Отчеты НИР, ОКР, ОТР, депонированные научные рукописи" (2667 (2001 г.), 2982 (2002 г.), 3301 (2003 г.), 3752 (2004 г.), 2770 (2005 г., ч. 1)).

Сярод надрукаваных галіновых і тэматычных дапаможнікаў звяртаюць на сябе ўвагу чарговыя выпускі паказальніка "Чарнобыль", у якіх адлюстраваны часткова анатаваныя афіцыйныя дакументы, матэрыялы канферэнцый, сімпозіумаў, артыкулы адпаведна за 1995–1997 гг. (3026 (2002 г.)) – 4609 назваў на беларускай і замежных мовах і за 1998–2000 гг. (3795 (2004 г.)) – 3756 назваў. Шматаспектнаму пошуку інфармацыі ў паказальніках спрыяе даведачны апарат у выглядзе імяннога, геаграфічнага паказальнікаў і паказальніка матэрыялаў сесій, кангрэсаў, нарад.

Неабходна таксама адзначыць паказальнік, падрыхтаваны Навукова-тэхнічнай бібліятэкай Беларускай чыгункі "Белорусская железная дорога на перекрестках столетий (1871–2001)" (3481 (2002 г.)), у якім сістэматызавана 1016 назваў на беларускай і рускай мовах афіцыйных, нарматыўна-тэхнічных дакументаў, зборнікаў артыкулаў, кніг, статыстычных матэрыялаў, альбомаў, бібліяграфічных дапаможнікаў. Матэрыял у паказальніку часткова анатаваны.

Амаль дзве трэці ад агульнай колькасці зарэгістраваных паказальнікаў па прыродазнаўстве і тэхніцы прыпадае на долю персанальных дапаможнікаў і паказальнікаў прац навукова-даследчых устаноў. Сярод іх неабходна назваць "Библиографический указатель научных трудов Института проблем энергетики (ИПЭ) НАН Беларуси по итогам выполнения государственной программы фундаментальных исследований "Энергетика" за 1996–2000 гг." (2986 (2002 г.)), у якім матэрыял сістэматызаваны па 8 тэмах, улічаны апублікаваныя і неапублікаваныя матэрыялы – патэнты, тэзісы дакладаў, справаздачы, прэпрынты, усяго 324 назвы на рускай і замежных мовах.

70-годдзю геаграфічнага факультэта БДУ прысвечаны паказальнік "Краткий библиографический указатель трудов географического факультета БГУ (1934–2004 гг.) (1894 (2005 г., ч. 1)), а 25-годдзю лабараторыі высокіх энергій – "Изданные научные труды сотрудников института физики им. Б. И. Степанова НАН Беларуси" (2357 (2004 г.)).

Бібліяграфічныя паказальнікі, прысвечаныя вядомым беларускім вучоным, рыхтуюць бібліятэкі многіх вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі. Так, Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт у серыі "Профессора УО "ВГТУ" надрукаваў паказальнікі "Владимир Евгеньевич Горбачик ..." (3433 (2005 г., ч. 1)), "Александр Григорьевич Коган ..." (3418 (2005 г., ч. 1)), прысвечаныя дактарам тэхнічных навук. Да 65-годдзя доктара тэхнічных навук, прафесара Э. М. Бабенкі (3320 (2003 г.)) у Полацку падрыхтаваны паказальнік у серыі "Ученые Полоцкого государственного университета".

Сярод персанальных бібліяграфічных паказальнікаў нельга не адзначыць серыю "Библиография ученых Беларуси", якую выпускаюць сумесна Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа і бібліятэкі галіновых навукова-даследчых інстытутаў НАН Беларусі. Паказальнікі рыхтуюцца па адзінай методыцы, добра паліграфічна афармленыя, прысвечаюцца акадэмікам і член-карэспандэнтам НАН. На працягу аналізуемага перыяду ЦНБ выпусціла больш за 20 такіх работ. Так, у па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

казальніку "Виктор Павлович Грибковский ..." (1890 (2002 г.)) адлюстравана 476 назваў манаграфій, аўтарскіх пасведчанняў, тэзісаў, дакладаў, кандыдацкіх дысертацый, абароненых пад кіраўніцтвам В. П. Грыбкоўскага, на беларускай, рускай і англійскай мовах. Паказальнік "Ростислав Георгиевич Жбанков ..." (1690 (2001 г.)) уключае публікацыі аўтара (манаграфіі, артыкулы, патэнты) за 1956–2000 гг., усяго 395 назваў.

Характэрызуючы гэты напрамак бібліяграфічнай прадукцыі неабходна назваць унутрыкніжныя паказальнікі "Знакамітыя замежныя матэматыкі" (1784 (2002 г.)) і "Вядомыя беларускія матэматыкі" (1783 (2002 г.)), надрукаваныя ў "Матэматычнай энцыклапедыі". Паказальнік, прысвечаны нашым землякам, утрымлівае 128 артыкулаў, кожны з якіх уключае кароткую характарыстыку асноўных дасягненняў навукоўца, спіс яго прац альбо літаратуру пра яго.

Падкрэсліваючы значэнне гэтага віда бібліяграфічнай прадукцыі для вырашэння пытання аб укладзе навукоўцаў у распрацоўку асобных галін, навуковых напрамкаў, тым не менш неабходна адзначыць, што пры агульным змяншэнні колькасці бібліяграфічнай прадукцыі такая ўвага да персанальных дапаможнікаў не можа ацэньвацца станоўча.

Улічваючы невялікую колькасць тэматычных дапаможнікаў, пэўную дапамогу спецыялістам могуць аказаць прыкніжныя спісы літаратуры. Сярод найбольш значных неабходна назваць манаграфію Лынькова Л. М. "Микроструктуры на основе анодной алюмооксидной технологии" (3049 (2002 г.)), у якой прыведзена 161 назва дакументаў, работу Матвейко Н. П. "Электродные материалы на основе бисилицидов металлов" (2641 (2004 г.)) 322 назвы, 195 крыніц прыведзена ў рабоце Коростик К. Н. "Управляемые инжекционные лазеры в информационно-измерительных системах" (3832 (2004 г.)).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУИР